*Жуков И.* Об атрибуции вислых печатей князей Рюрика, Володаря и Василько Ростиславичей // Нумизматика и Фалеристика, №4, 2012. С. 8–10.

*Жуков И. А.* Об атрибуции вислых печатей Полоцкого княжества XI–XII вв. // РЛО, № 2, 2016. С. 25–45.

*Жуков И.* Вислые печати великого князя Ростислава (Михаила) Мстиславича (1125–1167 гг.) // Нумизматика и фалеристика, 2017. № 3 (83). С. 34–39.

**В. І. Кошман, М. А. Плавінскі**
*Мінск, Беларусь*

# ЗНАХОДКІ ДРАГІЧЫНСКІХ ПЛОМБ З МІНСКА І ВАКОЛІЦАЎ (матэрыялы да каталога)

Мэтай прапанаванай працы з’яўляецца збор і сістэматызацыя свінцовых пломб «драгічынскага» тыпу з раскопак старажытнарускага Менска і яго бліжэйшага наваколля. На наш погляд, менавіта публікацыя наяўных калекцый мае зараз першачарговае значэнне, бо на працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў колькасць такіх знаходак з тэрыторыі Старажытнай Русі, верагодна, вырасла ў дзясяткі, калі нават не ў сотні разоў.

Рэзкі рост колькасці знаходак драгічынскіх пломб у працэсе археалагічных даследаванняў звязаны са зменамі ў методыцы іх правядзення – укараненнем тэхналогіі прамыўкі культурнага слою, а таксама шырокім распаўсюджаннем металадэтэктараў. З іншага боку, бескантрольнае выкарыстанне ўсё тых жа металадэтэктараў так званымі «аматарамі металапошуку» прывяло да фармавання велізарных прыватных калекцый свінцовых пломбаў, якія былі здабытыя падчас незаконных збораў археалагічных артэфактаў. Апрацоўка і сістэматызацыя такіх калекцый з'яўляецца надзвычай складанай задачай.

У сваю чаргу, публікацыя калекцый, сабраных падчас афіцыйных навуковых раскопак, уяўляецца надзвычай важнай для сучаснай старажытнарускай археалогіі, нумізматыкі і сфрагістыкі, бо менавіта сістэматызацыя гэтых знаходак, на нашу думку, можа даць падставы для выхаду на новы ўзровень асэнсавання месца драгічынскіх пломбаў у матэрыяльнай культуры і побыце Старажытнай Русі.

Нягледзячы на дастаткова маштабныя археалагічныя даследаванні, якія праводзіліся на Мінскім замчышчы ў другой палове XX ст., падчас гэтых прац была выяўлена ўсяго адна пломба драгічынскага тыпу.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

У 2009 г. раскопкі Замчышча былі адноўленыя, ў выніку чаго ў яго паўночна-усходняй частцы было выяўлена 7 пломбаў, якія датуюцца пачаткам XII ст. Аднак, асноўная частка мінскіх пломбаў паходзіць з тэрыторыі гарадского пасада. Адна з іх належыць да ліку выпадковых знаходак. Яшчэ 46 былі выяўленыя падчас раскопак на вул. Кірыла і Мяфодзія і могуць быць датаваныя XII–XIII стст.

Яшчэ 6 пломбаў паходзяць з археалагічнага комплекса на р. Менка (першапачатковага летапіснага Менска). Дзве з іх былі знойдзены А. В. Вайцяховічам падчас раскопак на селішчы ў 2012 г., яшчэ 4 былі выяўлены ў працэсе павярховых збораў на разаранай тэрыторыі селішча.

Яшчэ адным пунктам у ваколіцах Мінска, дзе падчас раскопак 2014–2015 гг. была выяўлена серыя з 8 пломбаў, з'яўляецца селішча Боўблі, размешчанае на паўночны захад ад горада (даследаванні З. А. Ільчышын і В. Л. Лакізы).

Такім чынам, на працягу апошняга дзесяцігоддзя падчас даследаванняў у Мінску і ваколіцах была сабраная прадстаўнічая калекцыя пломбаў драгічынскага тыпу, якая на дадзены момант налічвае 69 адзінак. У працэсе апрацоўкі гэтых матэрыялаў быў праведзены аналіз хімічнага складу 19 знаходак (даследаванні праводзіліся ў навукова-даследчай лабараторыі нелінейнай оптыкі і спектраскапіі фізічнага факультэта БДУ К. Ф. Ермаліцкай).

**Н. С. Моисеенко, С. В. Хаврин**
*Санкт-Петербург, Россия*

# СТАТИСТИЧЕСКИЕ ИССЛЕДОВАНИЯ СОСТАВА СРЕДНЕВЕКОВЫХ ПЛАТЕЖНЫХ СЛИТКОВ МЕТОДОМ РЕНТГЕНО-ФЛЮОРЕСЦЕНТНОГО АНАЛИЗА

Современные публикации о составе сплава средневековых платёжных слитков XI–XV вв., как правило, содержат информацию об экземплярах, находящихся в музейных собраниях (Яушева-Омельянчик, 1999; Рузас, 2006). За последние три года методом рентгенофлюоресцентного анализа (РФА) нами исследовано 138 слитков древнерусского серебра. Из них 56 – это слитки новгородского типа (31 гривна и 25 полтин), 27 –



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm